Парламенцкі дзённік

# ДЭМАКРАТЫЧНЫ ДЫЯЛОГ

**ЗАПРАШАЦЬ маладых людзей у парламент стала ўжо добрай традыцыяй адзначэння міжнароднага Дня дэмакратыі ў нашай краіне. Для дапытлівых і мэтанакіраваных адчыніліся дзверы ў прыстанак заканатворцаў і сёлета.**

Студэнты Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі пабывалі ў ніжняй палаце парламента. Там яны даведаліся пра дэпутацкія будні заканатворцаў з першых вуснаў... **Віталя БУСЬКО**, намесніка старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах і сувязях з СНД. Ён, між іншым, раней працаваў прарэктарам у БДУІР. Так што, шляхі дэпутацтва неспазнаныя. Можа, і хтосьці з сёлетніх наведнікаў Авальнай залы зойме калісь дэпутацкае крэсла.

Тонкасці заканадаўчай дзейнасці ў верхняй палаце парламента спасцігалі студэнты БДУ і Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта з дапамогай **Ніны МАЗАЙ, старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы**. «Дыялог паміж уладай і моладдзю карысны і неабходны, без яго грамадства і дзяржава не могуць нармальна функцыянаваць», — упэўнена сенатар. Яна прывяла прыклады, калі слушныя ідэі маладых людзей знаходзілі дзяржаўную падтрымку. Многія заўвагі навучэнцаў знайшлі адлюстраванне ў выніковым тэксце праекта Кодэкса аб адукацыі. Не засталіся без увагі ў свой час і прапановы па праекце закона аб асновах дзяржаўнай моладзевай палітыкі. Таму моладзь сёння павінна быць у добрым сэнсе крытычнай да ўсяго, акцэнтуе Н. Мазай, а таксама ўважлівай і цікаўнай. Яна распавяла студэнтам пра заканадаўчую і міжнародную дзейнасць Савета Рэспублікі, ролі прадстаўнічых органаў дзяржаўнай улады, асновы сучаснай моладзевай палітыкі. Як старшыня Савета Спецыяльнага фонду Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі яна таксама не па чутках ведае пра намаганні, якія прыкладае дзяржава, каб заахвоціць і стымуляваць сапраўды адораных юнакоў і дзяўчат. Сярод надзённых новаўвядзенняў, уведзеных па ініцыятыве Савета і прэзідэнта, — стажыроўкі для студэнтаў, аспірантаў, выкладчыкаў.

Падобны дыялог паміж парламентарыямі ды моладдзю, як і любы двухбаковы працэс, мае і двухбаковы эфект. Юнакі і дзяўчаты атрымліваюць цікавыя веды пра сістэму кіравання дзяржавай, працэс стварэння законаў і актуальныя пытанні міжнародных адносін. Прадстаўнікі ўлады, напрамую кантактуючы з моладдзю, інтарэсы якой яны таксама прадстаўляюць у заканадаўчай структуры, лепш адчуваюць іх настрой ды памкненні. А значыць, змогуць працаваць больш эфектыўна. Да таго ж, гэта зваротная сувязь — яны бачаць сталенне маладых і прагрэсіўных да таго, што робяць.

**Зоя ВАРАНЦОВА.**

Гучная справа

# СЛОВА АБВІНАВАЧВАНЫМ

**У Мінску працягваецца самае рэзананснае судовае разбіральніцтва ў гісторыі нашай краіны. На лаве падсудных — два 25-гадовыя хлопцы, родам з Віцебска. Ведаюць адзін аднаго з першага класа. Нежанатыя, раней не судзімыя. Галоўны абвінавачваны ў здзяйсненні тэракта ў мінскім метро 11 красавіка Дзмітрый Канавалаў да затрымання працаваў токарам на Віцебскім заводзе трактарных запчастак, яго магчымы саўдзельнік Уладзіслаў Кавалёў — электраманцёрам Мінскіх электрасетак. Матэрыялы крымінальнай справы складаюць больш чым 550 тамоў, па справе праходзіць 523 пацярпелыя, таму відавочна, што судовы працэс расцягнецца не на адзін тыдзень.**

Дзмітрый КАНАВАЛАЎ:

### «Я прызнаю віну ў выбуху ў метро»

У канцы першага судовага пасяджэння, якое адбылося 15 верасня, пракуратура прад'явіла абвінавачанне Дзмітрыю Канавалаву і Уладзіславу Кавалёву. Але маладыя людзі толькі часткова прызналі сваю віну. Так, Дзмітрый Канавалаў, заявіў, што гэта ён здзейсніў выбухі ў метро і на Дзень Незалежнасці. Але пры гэтым ён не лічыць сябе вінаватым у выбухах у Віцебску, у тым ліку і тых, якія следства вызначае як злоснае хуліганства. Кавалёў, у сваю чаргу, прызнаў, што з хуліганскіх памкненняў прымаў удзел у здзяйсненні трох выбухаў у Віцебску з 2000 па 2002. Але свайго саўдзельніцтва ў мінскіх тэрактах не прызнаў.

Уладзіслаў КАВАЛЁЎ:

### «Пра выбух у метро я даведаўся з навін»

Другі дзень судовага пасяджэння пачаўся з даследавання доказаў. Па ўсеагульнай згодзе вырашылі пачаць разгляд адразу з тэракта ў метро. Гэта звязана з тым, што асноўная колькасць пацярпелых, якія ў гэты дзень знаходзіліся ў зале, пацярпелі менавіта ад падзей 11 красавіка.

Першым задаваць пытанні пачалі мяркуемаму саўдзельніку выканаўцы і арганізатара тэрактаў Уладзіславу Кавалёву. Малады чалавек падчас папярэдняга расследавання сцвярджаў, што ведаў пра тое, што Канавалаў прывёз у Мінск бомбу. Учора ж на судзе змяніў свае паказанні і зрабіў нечаканую заяву.

— Свае паказанні, якія я даваў у папярэднім следстве, не пацвярджаю, — сказаў ён. — Яны былі дадзены пад псіхалагічным ціскам. Мяне запужалі адразу пасля затрымання — і я даў ілжывыя паказанні. Мне паказалі відэа, як Дзмітрый праходзіць у метро праз турнікет. Я пазнаў сябра адразу ж. А пасля з суседняга кабінета пачуў крыкі Канавалава. Я спужаўся. І мне тады сказалі, што лепш табе, хлопец, прызнацца, што ты ўсё ведаў. Маўляў, адсядзіш два гады за недаяненне, і ўсё. Я думаю, Дзмітрый не ўзрываў метро.

— Дык вы ж пазналі яго на відэа, — звярнуўся да Улада Кавалёва дзяржабвінаваўца.

— Мне паказалі толькі, як ён праходзіў праз турнікет. Ён, можа, проста гуляў у метро.

Між тым, відэазапіс допыту Уладзіслава Кавалёва не ўтрымлівае якіх-небудзь сведчанняў таго, што на яго аказвалі псіхалагічны ціск. Допыт вёўся ў прысутнасці адваката, супрацоўнікаў міліцыі і пракуратуры. На запісе бачна, што Кавалёў трымаўся спакойна.

Падчас допыту Кавалёў пацвердзіў свае папярэднія паказанні адносна таго, што напярэдадні выбуху — 9 красавіка 2011 года — размаўляў па тэлефоне з Дзмітрыем.

— Ён сказаў, што збіраецца прыехаць у Мінск. Запытаўся, куды я знік, чаму не тэлефаную. Яшчэ сказаў, што дрэнна сябе адчувае, бо піў напярэдадні. Але пра мэту свайго прыезду нічога не сказаў. Ды я і не пытаўся. І пра дактыласкапіраванне не гаварыў, я не ведаў, што ў яго 9 красавіка ўзялі адбіткі пальцаў.

На вакзале 10 красавіка Кавалёў сустрэў сябра, які з Віцебска ў Мінск вёз вялікую дарожную сумку. Але, сцвярджае, не цікавіўся, што было там унутры.

— Сумка была цяжкая, — сказаў Кавалёў. — Аднаму яе цяжка было б несці. А ўдвух нармальна. Мы панеслі ўдвух, там былі дзве ручкі. Наўскідку яна важыла кілаграм 10-15, можа менш.

— А навошта Дзмітрый Канавалаў прыехаў у Мінск? — працягваў задаваць пытанні пракурор.

— Я не ведаю. Сказаў, што прыехаў у Мінск па справах. Я не стаў распытваць, лезці ў яго справы.

Уладзіслаў Кавалёў расказаў, што яны з 10 па 12 красавіка пілі на здымнай кватэры гарэлку, слухалі музыку з тэлефона, глядзелі тэлевізар.

— 11 красавіка вечарам Дзмітрый сышоў — сказаў, па справах. Ён быў нападпітку, і я не хацеў, каб ён сыходзіў. Ён згадваў, што паедзе на метро, я яму сказаў, што п'яных туды не пускаюць. Вярнуўся недзе праз гадзіну ў цудоўным настроі. Усміхаўся, жартаваў. Па-мойму, гарэлкі яшчэ прынёс. Мы выпівалі, гутарылі. Пасля Дзмітрый лёг спаць, а мы з Янай (знаёмая Дзмітрыя па інтэрнэце, якая бавіла час на здымнай кватэры з абвінавачванымі) глядзелі навіны па тэлевізары. Там расказвалі пра тэракт. Паказвалі кадры з метрапалітэна, казалі, што 7 чалавек загінула. Мы здзівіліся, былі ў шоку. Дзмітрый у гэты час спаў. Раніцай сюжэт паказалі зноў. Яна расплакалася, Дзмітрый яе стаў супакойваць. Тэлевізар мы больш не ўключалі. Пасля мы зноў пілі, леглі спаць... Нас разбудзілі супрацоўнікі міліцыі ў масках.

Пасля таго, як Кавалёў змяніў свае паказанні, дзяржабвінаваўца папрасіў дазволу ў суддзі агучыць ранейшыя паказанні абвінавачванага.

«Пра тое, што ў сумцы было выбуховае прыстасаванне, я даведаўся на вакзале, — зачыталі паказанні, якія даваў Уладзіслаў Кавалёў падчас папярэдняга расследавання. — Калі я ўскінуў сумку на плячо, хацеў дапамагчы сябру, Дзмітрый сказаў, каб я быў больш акуратным, бо там бомба. Я спачатку не ўспрыняў яго словы ўсур'ёз. Адкрыў сумку ўжо на вуліцы, там сапраўды пад паперай была бомба».

У тэксце допыту змяшчаецца і прызнанне Кавалёва адносна таго, што ён бачыў, як Канавалаў злучаў правады ў сваім выбуховым прыстасаванні напярэдадні тэракта. На пытанне, чаму ён не паведаміў у міліцыю пра планы Канавалава, якое таксама было зададзена падчас папярэдняга следства, Кавалёў адказаў: «Таму што ён мой сябра». Разам з тым, згодна з паказаннямі, Кавалёў не ўяўляў маштабаў наступстваў апошняга выбуху. Так, ён узгадаў пра выбухі ў Віцебску, у выніку якіх ніхто моцна не пацярпеў. Акрамя таго, згодна з пратаколам папярэдняга следства, Кавалёў паведаміў, што Канавалаў пасля выбуху ў метро хацеў скончыць жыццё самагубствам. Паказваў яму таблеткі, якія, калі іх прыняць у вялікай колькасці, выклікаюць смерць. Учора ж на судзе Уладзіслаў адмовіўся і ад гэтых паказанняў. Маўляў, і думаць не думаў, што Канавалаў мог мець дачыненне да выбуху.

**Надзея ПАЎЛАВА.**

Анонс

### ЛЕПШЫЯ ПАШТАЛЬЁНЫ

**Учора РУП «Белпошта» ўшанавала сваіх работнікаў — узнагародзілі ўдзельнікаў і пераможцаў XV Рэспубліканскага конкурсу прафесійнага майстэрства аператараў сувязі і паштальёнаў па дастаўцы паштовых адпраўленняў і друкаваных сродкаў масавай інфармацыі.**

**«Звязда» таксама павіншавала лепшых работнікаў беларускай пошты. Інтэрв'ю з пераможцамі і новым дырэктарам «Белпошты» чытайце ў газеце на наступным тыдні.**

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

## Насельніцтва Беларусі стала больш актыўна здаваць валюту

**Насельніцтва Беларусі стала больш актыўна здаваць валюту ў абменныя пункты банкаў, перадае БЕЛТА.**

Большасць буйных банкаў краіны адзначаюць ажыўленне абменных аперацый і дадатную дынаміку як па здачы, так і па куплі замежных валют. Пры гэтым у некаторых абменніках назіраецца перавышэнне прапанавання валюты насельніцтвам над попытам.

Напрыклад, за ўчарашні дзень у абменныя пункты Беларусбанка насельніцтвам здадзена прыкладна $3,3 млн. Выраслі таксама аб'ёмы здачы еўра і расійскіх рублёў. «Гэта добрая тэндэнцыя, якая ўсяляе аптымізм і сведчыць аб тым, што аб'ёмы здачы валюты насельніцтвам аднаўляюцца», — адзначылі ў банку.

Прыкметная актывізацыя абменных аперацый адбылася і ў банку «Масква-Мінск», у абменнікі якога за ўчарашні дзень насельніцтвам здадзена каля $1,5 млн. «Аб'ёмы здачы былі сапраўды значныя, — расказалі ў банку. — Мы былі гатовы да такой сітуацыі, сфарміравалі дастатковы для абменных аперацый запас беларускіх рублёў, ніякіх праблем з няхваткай грошай не было».

Аб аднаўленні аб'ёмаў здачы насельніцтвам валюты заявілі і ў іншых банках, у тым ліку ў Белаграпрамбанку і БПБ-банку. Эксперты чакаюць, што гэта тэндэнцыя ў бліжэйшы час захаваецца і будзе развівацца, а ў выпадку далейшага зніжэння курсаў замежных валют на дадатковай сесіі валютна-фондавай біржы вырасце і попыт на валюту. Цяпер яна знаходзіцца ў свабодным доступе ў банках краіны. У той жа час ажыятажнага попыту на яе сярод насельніцтва пакуль няма.

Як паведамлялася, Нацбанк упэўнены ў выхадзе на адзіны раўнаважны абменны курс беларускага рубля за 1,5-2 месяцы. Нацбанк праводзіць работу па нарошчванні золатавалютных рэзерваў, у тым ліку для магчымага ўдзелу ў правядзенні інтэрвенцый.

Рыштаванні Бацькаўшчыны

# ЧЫРВОНАБЯРЭЖСКІ ЦУД

**На працягу чвэрці стагоддзя ў Чырвоны Бераг з далёкай Сібіры прыязджалі на адпачынак уладальнікі сядзібы Козел-Паклеўскія. Сядзіба ў Жлобінскім раёне, галоўны маёнтак якой цяпер знаходзіцца на рэстаўрацыі, была пасагам, з якім за Вікенція Альфонсавіча Козел-Паклеўскага аддаў сваю дачку Марыю генерал-лейтэнант Міхаіл Сямёнавіч Гатоўскі. Калі рэстаўрацыя нарэшце закончыцца, сядзіба стане філіялам гісторыка-краязнаўчага музея горада Жлобіна. А пакуль яго супрацоўнікі збіраюць матэрыялы пра людзей, якія пабудавалі шыкоўны маёнтак і жылі тут час ад часу.**



Вікенцій Паклеўскі.

Старшы навуковы супрацоўнік гісторыка-краязнаўчага музея горада Жлобіна Кацярына Цісецкая пацвярджае, што, на жаль, практычна нічога не вядома пра асобу генерал-лейтэнанта інжынерыі Міхаіла Гатоўскага. А вось пра яго свата, Альфонса Козел-Паклеўскага, вядома значна больш.



Чырвоны бераг — маёнтак у працэсе рэстаўрацыі.

### Варыяцыі з прозвішчам

Ён быў нашчадкам вядомага шляхецкага роду, карані якога губляюцца ў XIV стагоддзі. Між іншым, прозвішча ў розных крыніцах па-руску згадваецца па-рознаму: «Козелл-Поклевский, Козелло-Поклевский, Козел-Поклевский, Поклевский-Козел». Але ж размова ідзе пра адзін род. Ужо ў 1415 годзе заснавальнік роду Козел выконваў пры вялікім князі Вітаўце дыпламатычныя даручэнні. І ў далейшым яго нашчадкі займалі самыя высокія дзяржаўныя пасты. Не раз яны атрымлівалі ад вялікага князя і зямельныя надзелы. Гэтыя выхадцы з беларускага Прыдняпроўя валодалі ўласнасцю ў многіх паветах ВКЛ. Напачатку XVII стагоддзя ад назвы аднаго з маёнткаў — Паклева — у Ашмянскім павеце яны сталі звацца Козел-Паклеўскімі. Або Паклеўскімі-Козел. Або проста Паклеўскімі.

### Лепельскія карані

Будучы расійскі алігарх Альфонс Фаміч Козел-Паклеўскі нарадзіўся ў 1809 годзе ў маёнтку Быкоўшчына Лепельскага павета Віцебскай губерні. Сын Тамаша і Ганны Козел-Паклеўскіх бліскуча скончыў школу дамініканцаў ва Ушачах і калегіум у Полацку, вучыўся ў Віленскім універсітэце. Але кар'еру вырашыў рабіць на бясконцых расійскіх прасторах. У яго паслужным спісе — дзяржаўная служба ў Санкт-Пецярбургу, Астрахані, Томскай губерніі. У 1836 годзе ён быў прыняты ў штат генерал-губернатара Заходняй Сібіры, а ў 1843-м Альфонс Козел-Паклеўскі быў прызначаны чыноўнікам па спецыяльных даручэннях пры генерал-губернатары Заходняй Сібіры П. Гарчакове. Паралельна ён пачаў займацца камерцыйнымі справамі, аднак да часу не пакідаў дзяржаўнай службы. Да 1840-х гадоў пазамінулага стагоддзя Альфонс быў ужо багаты і паважаны ў Сібіры і на Урале чалавек. У 1843 ён заснаваў першае ў Сібіры параходства, якое амаль цэлых трыццаць гадоў заставалася манапалістам, прыносячы велізарны прыбытак.

### Ажаніцца — на ліцвінцы!

Цікава, што толькі ў 1850 годзе ўладальнік параходаў задумаўся пра асабістае жыццё. Яго выбранніцай стала дваццацігадовая ліцвінка Анжаліна Іосіфаўна Рымша. Жаніцьба дала імпульс развіццю яго прадпрымальніцкай дзейнасці, і з канца 1850-х гадоў ён актыўна ўключыўся ў распрацоўку праекта Уральскай чыгункі: Масква—Перм—Екацярынбург—Цюмень. З гэтага часу імперыя Козел-Паклеўскага надзейна злучана з заходнімі прамысловымі раёнамі Расійскай імперыі. Пра імперыю — зусім не перабольшанне. Пад яго кіраваннем апынуліся велізарныя фінансавыя, прамысловыя, прыродныя і чалавечыя рэсурсы. На першае месца яго прадпрымальніцкіх інтарэсаў выходзіць піцейная прамысловасць.

### Шматпрофільны алігарх

Напярэдадні 1917 года ўральскія заводы Козел-Паклеўскіх выраблялі 1/5 частку ўсяго спірту Расіі. Паступова Альфонсу сталі належаць прадпрыемствы па перапрацоўцы жалеза, чыгуну, стэарыну, шкляныя прадпрыемствы, а таксама залатыя, азбеставыя, срэбныя, медныя, жалезныя руднікі, капальні смарагдаў і александрытаў, ён з'яўляўся найбуйнейшым землеўладальнікам Сібіры.

Альфонс Фаміч паслужыў пісьменніку Маміну-Сібіраку прататыпам для некаторых герояў: Ляхоўскага ў рамане «Прывалаўскія мільёны» і Майстаброўскага — у рамане «Хлеб». Апошні паказаны не толькі як буйны камерсант, але і як інтэлігент, арыстакрат, выдатны сем'янін і гуманны чалавек.



Зала Чырвонабярэжскага маёнтка ў праекце рэстаўратараў.

Жонка таксама часу не марнавала і падарыла мільянеру пяцярых дзяцей. Старэйшы з іх, Вікенцій, стаў асноўным нашчадкам не толькі багацця паспяховага бацькі-прадпрымальніка, але і маёнтка ў Чырвоным Беразе, пра які зноў пойдзе размова. Узначаліўшы справы бацькі пасля яго смерці, Вікенцій не забыўся пра гістарычную радзіму, дзе яму належалі дрожджа-броварны завод у Бабруйску і маслабойны завод у Мінску. Менавіта пры Вікенціі Козел-Паклеўскім значна пашырыўся і комплекс у Чырвоным Беразе, які і зараз уключае не толькі палац, але і флігель, гаспадарчыя пабудовы, спіртзавод, пышны парк з садам, бярозавымі і ліпавымі алеямі за цаглянай агароджай і брамай. Як распавядаюць старажылы, кароўнікі ў сядзібе былі з аўтаматычным злівам гною.

### У глыбіню стагоддзяў

Населены пункт Чырвоны Бераг сваю гісторыю адлічвае ад 1528 года. І пачырванеў ён зусім не ад падзей 1917 года, калі свае назвы на «чырвоныя» мяняла амаль што кожная другая вёска. Адна з версій паходжання назвы — прыгожы бераг, які сонца афарбоўвае ў чырвоны колер. А яшчэ тут многа гліны, якая, вядома, таксама мае чырвоны колер.

Пасля падзелу Рэчы Паспалітай беларускія землі ўвайшлі ў склад Расійскай імперыі. Паводле адміністрацыйна-тэрытарыяльнай рэформы 90-х гадоў 18 стагоддзя Чырвоны Бераг быў уключаны ў склад Бабруйскага павета Мінскай губерніі. З часам гэты ціхі і маляўнічы куток паўночна-заходняга краю сталі ахвотна асвойваць рускія дваране і частка заможнай беларускай шляхты, якая прысягнула на вернасць расійскай манархіі.

### Па чыгунцы да Паклеўскіх

У 1815 годзе адным з першых уладальнікаў маёнтка, пабудаванага ў Чырвоным Беразе, стаў памешчык І. Грыневіч. Затым былі і іншыя. Гісторыя Чырвонага Берага звязана і з падзеямі паўстання дзекабрыстаў 1825 года, а таксама з паўстаннем 1863 года ў Польшчы і Беларусі, удзельнікам якога і быў І. Грыневіч. У 80-я гады XIX стагоддзя ўладальнікам сядзібы стаў генерал-лейтэнант Міхаіл Гатоўскі, які і падарыў сваёй дачцэ Марыі маёнтак як пасаг. У сваю чаргу дзелавы і багаты зяць Вікенцій Альфонсавіч Козел-Паклеўскі не толькі пабудаваў новы палац на месцы спадчыннай сядзібы, але і, напэўна, выкарыстоўваў на рэдкасць зручнае геаграфічнае размяшчэнне населенага пункта. Праз Чырвоны Бераг праходзіла адна з найбуйнейшых чыгунак Расійскай імперыі, якая злучала паўночны захад і поўдзень велізарнай краіны. Яна мела назву Лібава-Роменская чыгунка. І зараз частка гэтай дарогі злучае Мінск, Бабруйск, Жлобін, Гомель. Нават хуткасныя пасажырскія цягнікі абавязкова спыняюцца на станцыі Чырвоны Бераг.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
**Фота аўтара і прадастаўленае гісторыка-краязнаўчым музеем горада Жлобіна.**

*(Працяг будзе.)*

Акцыя

## Адмоўся ад аўто на дзень — захавай чыстае паветра

**22 верасня ў краіне пройдзе чарговая штогадовая міжнародная акцыя «Дзень без аўтамабіля». Мінпрыроды прапануе грамадзянам хоць бы адзін дзень устрымацца ад выкарыстання аўтамабільнага транспарту, далучыўшыся да ўдзельнікаў мерапрыемства.**

Дзякуючы тым захадам, якія прымаюцца ў Беларусі па зніжэнні шкоднага ўздзеяння транспарту на навакольнае асяроддзе, за мінулы год атрымалася зменшыць выкіды забруджвальных рэчываў у атмасфернае паветра ад мабільных крыніц больш чым на 17 працэнтаў. Гэта пры павелічэнні парка аўтатранспартных сродкаў за гэты ж перыяд (на пачатак бягучага года ён налічваў 3 597,8 тысячы адзінак). У сярэднім за дзень па краіне летась выкідвалася каля 2 580 тон забруджвальных рэчываў (у 2009 годзе — каля 3 115 тон), у тым ліку па Мінску каля 430 тон.

За мінулы год у краіну было ўвезена 209 012 аўтатранспартных сродкаў, у тым ліку 193 710 адзінак — фізічнымі асобамі. З агульнай колькасці больш за 56 працэнтаў складалі аўто ўзростам больш за 7 гадоў (за папярэдні год такіх аўтатранспартных сродкаў было больш за 60 працэнтаў).

У сярэднім пры прабегу аўтамабілем за год 15 тысяч кіламетраў ім спальвацца больш за 2 тоны паліва і спажываецца каля 30 тон паветра. Пры гэтым у атмасферу выкідваецца каля 700 кілаграмаў угарнага газу, 400 кілаграмаў дыяксіду азоту, 230 кілаграмаў вуглевадародаў і іншых забруджвальных рэчываў, агульная колькасць якіх складае больш за 200 найменняў.

Ці ёсць карысць ад правядзення такіх акцый? На гэту карысць сведчаць факты паляпшэння якасці паветра ў гарадах, а таксама тое, што толькі за гэты адзін дзень 22 верасня штогод папярэджваецца выкід забруджвальных рэчываў у атмасферу ў аб'ёме ад 250 тон і больш.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# «ПАСАЖЫРКА» З БРОНЗАВЫМ СЭРЦАМ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Наведнікі вакзала ў захапленні ад дзяўчыны. Яны і фатаграфуюцца з ёй, і абдымаюцца, і цалуюцца, і імкнуцца падступіцца з якога толькі магчыма боку. А некаторыя спрабуюць падскочыць, каб быць з ёй аднаго росту. Абдзеленыя каханнем мужчыны гладзяць ёй і калені, і іншыя часткі цела, відаць, сапраўды шкадуючы, што яна не жывая. Аднак прыгажуня застаецца непрыступнай і раўнадушна глядзіць наперад. За гэта яна паспела нажыць сабе ворагаў. «Пасажырцы» ўжо два разы адрывалі завушніцы. Прычым зрабіць гэта можна было, толькі павіснуўшы на іх. Насіць такое ўпрыгажэнне наўрад ці атрымаецца, ды і каштоўнага металу там зусім мала. Чарговыя завушніцы прымацуюць з дапамогай гарачай зваркі. Так яны даўжэй паслужаць прыгажуні і будуць выратаваныя ад несумленных прыхільнікаў.

«Гераіня вакзала» мае сапраўдны прататып — дзяўчыну Надзею, якая вучылася ў Беларускім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце, а зараз працуе ў Мінску спецыялістам па падборы кадраў. Надзея вельмі любіць ездзіць па розных гарадах і краінах, а таму дух падарожжаў уласцівы як самой дзяўчыне, так і яе адбітку.

Асабіста мне імпануе тое, што «Пасажырка» сімвалізуе студэнтку, якая вяртаецца ў родны горад. Гэта як маладосць, якая ніколі не пакіне Маладзечна і заўсёды будзе яго верным спадарожніцай.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**

**Управляющий в деле о банкротстве фермерского хозяйства «Савицкий В.В.» Журов Вячеслав Алексеевич (организатор конкурса) извещает о проведении 18 октября 2011 года повторного конкурса по продаже имущества фермерского хозяйства «Савицкий В.В.» в 11.00 в городе Калинковичи по улице Интернациональной, 32**

| № лота | Наименование имущества, подлежащего продаже по конкурсу | Начальная цена продажи, с НДС, руб. РБ | Задаток, с НДС, руб. РБ |
|---|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инвентарным номером 333/С-20156 (здание нежилое) площадью 270,0 м² по адресу: 247710, г. Калинковичи, ул. Интернациональная, 32, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 322350100002002649, площадью 0,1144 га | 107448768 | 5372438 |

**Продавец: Фермерское хозяйство «Савицкий В.В.», телефон: 80291225018, 80291730672.**

**Имущество расположено по адресу:** г. Калинковичи, ул. Интернациональная, 32, 247710, Гомельская область. Ознакомиться с имуществом можно в рабочие дни с 9.00 до 13.00 от даты опубликования настоящего извещения по 17 октября 2011 включительно.

Условия конкурса: Сохранение назначения здания, создание новых рабочих мест.

К участию в конкурсе допускаются лица, которые своевременно подали заявления на участие в конкурсе по форме, определенной организатором конкурса, внесли в установленном порядке задаток для участия в конкурсе, представили другие необходимые документы, зарегистрировались в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, получили билет участника конкурса, подписали соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения конкурса.

Документы на участие в конкурсе принимаются по адресу: **г. Калинковичи, ул. Интернациональная, 32** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 от даты опубликования настоящего извещения ***по 17 октября 2011 г. включительно***. Подача документов по почте не допускается.

При подаче заявления в адрес организатора конкурса представляются:

копия платежного поручения о внесении суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации (без нотариального засвидетельствования); юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копия свидетельства о государственной регистрации юридического лица (без нотариального засвидетельствования); иностранным юридическим лицом, иностранной организацией, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств, иностранным государством и их административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организацией – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов, выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо эквивалентное доказательство статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией (без нотариального засвидетельствования); представители гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность, оформленную в соответствии с законодательством.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие в них. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается организатором торгов в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов.

**Задаток для участия в конкурсе перечисляется на расчетный счет Продавца: р/с 3012206250028 в отделении ОАО «Белагропромбанк» г. Калинковичи, МФО 151501937, УНП 490495377 не позднее 17 октября 2011.**

Победителем торгов будет признан участник, который предоставит наилучшее предложение по условиям конкурса, в том числе наивысшую цену покупки имущества. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах конкурса в день проведения конкурса; заключить договор купли-продажи в срок не позднее 10 календарных дней от даты подписания протокола о результатах конкурса; оплатить приобретаемое имущество в срок, определенный в договоре купли-продажи. Задаток, уплаченный участником конкурса, ставшим победителем, будет учтен в счет исполнения обязательств по оплате приобретенного имущества на конкурсе по договору купли-продажи. В случае признания конкурса несостоявшимся по причине подачи заявления на участие в нем только одним участником, возможна продажа предмета торгов этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

*Ранее извещение о проведении конкурса по продаже имущества было опубликовано в газете «Звязда» 23.02.2011 № 35/26899.*

**Дополнительная информация по контактным телефонам: 8 0291225018, 8 0291730672.**

## ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

**ООО «СИ-трейдинг» на строительство жилого дома № 6 (типовых потребительских качеств) по г/п в микрорайоне № 1 жилого района «Копище» в Минском районе**

**Информация о застройщике:**

Общество с ограниченной ответственностью «СИ-трейдинг». Зарегистрировано решением Минского областного исполнительного комитета от 30 апреля 2003 г. № 318 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 690237128.

Место нахождения: 223053, Республика Беларусь, Минский район, район деревни Боровая 1, Главный корпус, каб. 439, телефон/факс 237 94 03.

Режим работы: понедельник-пятница: с 09.00 до 18.00, выходные дни – суббота, воскресенье, обед: 13.00-14.00;

работа не производится в государственные праздники и праздничные дни.

**Сведения о проектах строительства:**

В течение предыдущих трех лет ООО «СИ-трейдинг» реализованы следующие проекты:

• 167-квартирный 23-этажный жилой дом по ул. Лопатина, 5 в д. Копище Минского района Минской области.

**Информация о проекте строительства:**

Цель строительства – исполнение инвестиционного проекта по договору о привлечении средств для финансирования жилищного строительства в границах: ул. Гинтовта г. Минска – восточная граница лесного массива, прилегающего к Минской кольцевой автомобильной дороге и автодороге «Минск-Витебск» – автодорога «Колодищи – Заславль» – западная граница лесного массива, прилегающего к автодороге «Колодищи – Заславль».

Реализация проекта осуществляется в соответствии с решением Минского районного исполнительного комитета от 21.01.2010 г. № 90 «О разрешении строительства ООО «СИ-трейдинг» объекта: «Жилые дома (типовых потребительских качеств) №№ 5,6,7 на территории микрорайона № 1 жилого района «Копище» с выделением пусковых комплексов № 1, № 2 и № 3. Жилой дом № 6. Пусковой комплекс № 2».

Начало строительства – 1 квартал 2011 года.

Проектная документация, прошла в установленном порядке государственную экспертизу на основании полученных заключений в РУП «Госстройэкспертиза по Минской области» от 30.01.2009 г. № 3743-9/08, Минском областном комитете природных ресурсов и охраны окружающей среды от 30.09.2008 г. № 435.

Строящийся жилой дом расположен на территории микрорайона №1 жилого района «Копище» Минского района, рядом с освоенными городскими территориями – районом многоквартирной жилой застройки «Уручье» с развитой городской инфраструктурой – с юга граница города Минска – ул. Гинтовта, с запада и севера – территория деревни Копище, с востока – лесной массив УП «Минское лесопарковое хозяйство».

Объект долевого строительства – многоквартирный 23-этажный, 160-квартирный жилой дом № 6 по генплану (типовых потребительских качеств), с подвалом, техподпольями и теплым чердаком, высота жилых этажей – 3,0 метра, потолка 2,78 м. Фундамент выполнен в виде монолитного каркаса с буронабивными сваями. Жилой дом оборудован лифтами с лифтовым мусоропроводом.

Наружная отделка – фасад оштукатуривается и окрашивается белым, серым и золотисто-охристым цветом. Все квартиры имеют летние помещения (лоджии).

Жилая часть общей площадью квартир 10681,27 м², всего квартир 160, в том числе: однокомнатных – 38 шт., двухкомнатных – 80 шт., трехкомнатных – 40 шт., пятикомнатных – 2 шт. На первом этаже и в подвальной части жилого дома предусмотрены встроенные помещения административного и общественного назначения общей площадью 874,63 м².

Согласно Указу Президента Республики Беларусь от 15.06.2006 г. № 396 «О долевом строительстве многоквартирных жилых домов», для привлечения физических лиц, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц и индивидуальных предпринимателей к строительству по договорам создания объекта долевого строительства предлагается 27 квартир в текущих ценах на момент опубликования проектной декларации:

- однокомнатные – максимальной общей площадью 46,16 м² стоимостью 8 500 000 белорусских рублей, что эквивалентно 1000 долларов США за 1 м² – 5 (пять) квартир;

- двухкомнатные – максимальной общей площадью 65,9 м² стоимостью 8 330 000 белорусских рублей, что эквивалентно 980 долларов США за 1 м² – 10 (десять) квартир;

- трехкомнатные квартиры – максимальной общей площадью 89,54 м² стоимостью 8 160 000 белорусских рублей, что эквивалентно 960 долларов США за 1 м² – 10 (десять) квартир;

- пятикомнатные квартиры – максимальной общей площадью 129,31 м² стоимостью 8 160 000 белорусских рублей, что эквивалентно 960 долларов США за 1 м² – 2 (две) квартиры.

Подлежащая оплате в белорусских рублях сумма определяется по курсу, установленному соглашением сторон договора создания объектов долевого строительства на день заключения договора (день платежа), согласно графику платежей, предусмотренного договором.

Межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыши, технические этажи и подвалы, другие места общего пользования, несущие, ограждающие несущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания, поступают в общую собственность дольщиков, если финансирование этих объектов проводилось всеми дольщиками.

Благоустройство включает озеленение территории, предусмотрено устройство тротуаров, дорожек, детской и хозяйственной площадок, автостоянки для временного хранения автомобилей.

**Застройщиком получены:**

- разрешение на строительство Минского районного исполнительного комитета от 21.01.2010 г. № 90;

- свидетельство (удостоверение) о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права постоянного пользования на него от 08.10.2009 г. № 600/192-6689;

- проектно-сметная документация, прошедшая в установленном порядке государственную экспертизу, заключение РУП «Госстройэкспертиза по Минской области» от 30.01.2009 г. № 3743-9/08;

- заключение государственной экологической экспертизы Минского областного комитета природных ресурсов и охраны окружающей среды от 30.09.2008 г. № 435;

- договор строительного подряда с ОАО «Строительный трест № 4» № 55/26-2010 от 19.07.2010 г.;

- выданное Инспекцией департамента контроля и надзора за строительством по Минской области разрешение на производство строительно-монтажных работ от 15.03.2011 г. № 1-111Ж-140/11.

Предполагаемый срок ввода в эксплуатацию жилого дома – 3 квартал 2012 года.

**С планировкой квартир можно ознакомиться по адресу: Минский район, р-н д. Боровая 1, Главный корпус, каб. 439 (Бизнес центр «Аквабел»). Дополнительную информацию можно получить по телефонам: 237 94 03, 8(029) 606 29 96.**

УНП 690237128.



Абраз Бялыніцкай Божай Маці.

# КРЫЖ І КАРОНА

**Адноўлены фрагмент фрэскі XVIII стагоддзя «Нясенне крыжа» прадставіў Магілёўскі мастацкі музей імя Паўла Масленнікава.**

Гэтая каштоўная фрэска знаходзілася калісьці ў Бялыніцкім касцёле кармелітаў. Касцёла цяпер няма, затое па-ранейшаму вядомы ва Усходняй Беларусі і лічыцца цудатворным абраз Бялыніцкай Божай Маці, які там захоўваўся. Гэтымі днямі адзначаецца 250-годдзе каранавання абраза, і менавіта да гэтай даты музей прадставіў свой новы каштоўны экспанат. Урачыста каранаваны ў 1761 годзе абраз змясцілі ў новым касцёле, які распісалі фрэскамі.

У музейнай экспазіцыі «Захаваная спадчына» ўжо ёсць адна сабраная з кавалкаў і адрэстаўраваная фрэска «Ператварэнне Гасподняе». Цяпер па фрагментах збяруць яшчэ адну. Фрэска «Нясенне крыжа» мае алегарычны сэнс: кожны нясе свой крыж.

Сам абраз Бялыніцкай Божай Маці, упрыгожаны сапраўднай каронай, знік даўно і бясследна, аднак захаваліся старажытныя спісы (копіі) абраза, якія вернікі лічаць таксама цудатворнымі. Адзін з такіх спісаў можна пабачыць у Магілёўскім мастацкім музеі.

**Ілона ІВАНОВА.**

# БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТ ТРАПІЎ У ТОП-700 ЛЕПШЫХ УНІВЕРСІТЭТАЎ СВЕТУ

**Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт упершыню ўвайшоў у ТОП-700 лепшых універсітэтаў свету паводле рэйтынгу брытанскага агенцтва QS (THE — QS World University Rankings 2011/2012). Ён трапіў у групу ВНУ, якія займаюць з 501-й па 550-ю пазіцыі.**

Сярод ВНУ СНД, якія таксама трапілі ў гэты рэйтынг, БДУ займае 9-е месца. Такую ж пазіцыю ён займае і сярод ВНУ Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. А ўзначальвае рэйтынг Кембрыджскі ўніверсітэт. Маскоўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя М. Ламаносава займае 112 пазіцыю, Санкт-Пецярбургскі — 251 радок, Новасібірскі — 400 месца. Варшаўскі ўніверсітэт знаходзіцца ў рэйтынгу наперадзе БДУ, а Вільнюскі — у групе ВНУ з 551 па 600 пазіцыі.

Рэйтынг QS заснаваны на аналізе інфармацыі аб ВНУ і апытаннях экспертаў, якія бяруць пад увагу наступныя паказчыкі: акадэмічную рэпутацыю ВНУ, рэпутацыю яе сярод працадаўцаў, індэкс цытавання навуковых работ за апошнія 5 гадоў, суадносіны колькасці выкладчыкаў і студэнтаў, колькасць замежных студэнтаў і супрацоўнікаў. Адным з важнейшых крытэрыяў пры вызначэнні рэйтынгу з'яўляецца акадэмічная рэпутацыя вышэйшай навучальнай установы. Гэты паказчык займае 40 працэнтаў ад усёй ацэнкі і сведчыць, наколькі прафесары ўніверсітэта вядомыя сусветнай акадэмічнай грамадскасці па сумесным удзеле ў даследчых праектах, канферэнцыях, па публікацыях у міжнародных навуковых выданнях. Індэксу цытавання адводзіцца 20 працэнтаў, рэпутацыі сярод працадаўцаў — 10 працэнтаў, крытэрыям суадносін колькасці выкладчыкаў і студэнтаў 20 працэнтаў, а таксама 5 працэнтаў — колькасці замежных студэнтаў і супрацоўнікаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# Амур не падвёў

**Каманда Смаргонскай пагранічнай групы перамагла на міжнародных спаборніцтвах кінолагаў па біятлоне ў латвійскім горадзе Рэзекне.**

Сярод трынаццаці камандаў з Латвіі, Літвы і Беларусі смаргонскія спецыялісты кіналагічнай справы прадэманстравалі найлепшую хуткасць, стральбу, а таксама зладжанасць дзеянняў са сваімі выхаванцамі і партнёрамі па службе. Сярод апошніх асабліва вызначылася бельгійская аўчарка па мянушцы Амур, разам з якой на вышэйшую ступень п'едэстала (у асабістым заліку) падняўся намеснік начальніка аддзялення кіналагічнага цэнтра, старшы лейтэнант В. Лінга.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

Дарагі сыночак, унук, пляменнік, шаноўны зямляк і сусед **Міхаіл Міхайлавіч Голец** са Слуцка! Прымі нашы сардэчныя віншаванні з нагоды 18-годдзя з дня нараджэння! Зычым здароўя, правільнага жыццёвага выбару. Няхай для цябе матчына працавітасць, дабрыня і прыстойнасць будуць сапраўднымі спадарожнікамі ў жыцці.



**Твае родныя і Новік Т.І.**

**ЗАВЕРЕНО**

Департамент по ценным бумагам
Министерства финансов
Республики Беларусь

_____________А.Л.Гальперин
15.09.2011 г.

**УТВЕРЖДЕНО**

Протокол заседания
Наблюдательного совета
ОАО «АСБ Беларусбанк»

09.09.2011 № 27

БЕЛАРУСБАНК

# КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ

## об открытой продаже облигаций Открытого акционерного общества «Сберегательный банк «Беларусбанк» сто семнадцатого выпуска

### Раздел 1
### ОБЩИЕ СВЕДЕНИЯ ОБ ЭМИТЕНТЕ

**1. Полное и сокращенное наименование эмитента (на белорусском и русском языках)**

Наименование эмитента на белорусском языке:

полное: Адкрытае акцыянернае таварыства «Ашчадны банк «Беларусбанк»;

сокращенное: ААТ «Акцыянерны Ашчадны банк «Беларусбанк» (ААТ «ААБ Беларусбанк»);

наименование эмитента на русском языке:

полное: Открытое акционерное общество «Сберегательный банк «Беларусбанк» (в дальнейшем именуемое «Банк»);

сокращенное: ОАО «Акционерный Сберегательный банк «Беларусбанк» (ОАО «АСБ Беларусбанк»).

**2. Место нахождения эмитента, телефон, факс, электронный адрес (e-mail)**

Место нахождения Банка: Республика Беларусь, 220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32.

телефон: (017) 218 8408; телефон/факс: (017) 222 2626;

e-mail: info@belarusbank.by.

**3. Номера расчетного и/или валютного счетов эмитента, на которые будут зачисляться средства, поступающие при проведении открытой продажи облигаций**

Юридические лица – резиденты и нерезиденты Республики Беларусь, изъявившие желание приобрести облигации сто семнадцатого выпуска Банка (в дальнейшем именуемые совокупно «Облигации») на внебиржевом рынке, обязаны перечислить Банку денежные средства в безналичном порядке на балансовый счет 4940 в Банке, код 795 в соответствии с договором открытой продажи Облигаций.

Расчеты при продаже Облигаций на биржевом рынке проводятся в соответствии с регламентом расчетов в Открытом акционерном обществе «Белорусская валютно-фондовая биржа» (в дальнейшем именуемое «Биржа»).

Нерезиденты Республики Беларусь могут приобретать Облигации в соответствии с требованиями действующего законодательства Республики Беларусь.

**4. Наименование периодического печатного издания, в котором будет публиковаться бухгалтерская отчетность эмитента в составе, определенном законодательством, и сроки ее публикации**

В соответствии с пунктом 7 Инструкции о порядке раскрытия информации банками и небанковскими кредитно-финансовыми организациями, утвержденной постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 19.01.2006 № 6, годовой отчет Банка за 2010 год опубликован в газете «Звязда» 14.04.2011 № 69.

**5. Наименование депозитария, обслуживающего эмитента**

Депозитарием эмитента является депозитарий Банка (номер государственной регистрации Банка – 056, код депозитария Банка – 005), расположенный по адресу: Республика Беларусь, 220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32, действующий на основании специального разрешения (лицензии) на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам № 02200/5200-1246-1089 (сроком действия до 29.07.2012).

